
Мечыслаў Курыловіч
Прыдарожная
вярба

**Мечыслаў Курыловіч**

# Прыдарожная вярба

**Вершы**

**Гродна**
**"Гродзенская друкарня"**
**2008**

УДК 821.161.3.1
ББК 84 (4Беи)-5
К 93

Курыловіч М.П.
К93 Прыдарожная вярба: вершы / Мечыслаў Курыловіч.
Гродна: Гродзенская друкарня, 2008. – 106 с.

ISBN 978-985-6835-33-2

**УДК 821.161.3.1**
**ББК 84 (4Беи)-5**
**К 93**

**ISBN 978-985-6835-33-2**

Курыловіч М.П.,2008
Афармленне. ГОУПП
" Гродзенская друкарня"

## Прыдарожная вярба

Ломіць рукі свавольнік-вецер,
Абдзірае бакі мароз,
І скрыпучую долю ўвечар
Працінае амаль да слёз.

Не вясеннія перазвоны
І не мройныя сны ў траве –
Сівагрывую шапку кроны
Ураганная хваля рве.

Шлях да вечнасці цераз путы
І не скінуць хамут з гарба,
З нараджэння, як крыж пакуты,
На вятрышчы нясе вярба.

## Няўдобіцы

Маўчаць залатыя няўдобіцы,
Затузаны мудрай хлуснёй...
Нявестаю ім не аздобіцца,
Не быць гаварлівай вясной.

Быльнёг скаваў поле здзічэлае,
Асот ахрысціў небакрай...
Тут душы, губляючы цела,
У злыдня выпрошваюць рай.

Тут вочы пазычыць не сорамна,
Тут кпін і няшчырасці стык,
Калі ў справаздачах пра ворыва
Не месціцца ў роце язык.

Маўчаць залатыя няўдобіцы,
І ў сне, патураючы сну,
Нявестай спяшаюць аздобіцца,
Сустрэць у аздобе вясну.

## На высечцы

Кругом бы кучы буралому
І чорны колер былых фарбаў –
Пад гул раскацістага грому
Няйначай дзейнічаў тут варвар.

Будзіць не будзем памяць продкаў
Каб нам кіўнулі ў знак падзякі
За лёс лясны, што стаў кароткім
З навейшай меркаю адзнакі.

На учарнела-свежым полі
Бялеюць душы сосен пнямі
І не узняцца ім ніколі
Бацькоўскай шапкаю над намі.

## Калгасная восень

Восень доўжыць цемень ночы
Ў тайнай змове з днём нібыта,
Дзе за кадрам – кадры крочаць
Да калгаснага карыта.

І не кадрам ноч рыхтуе
Падарункі ў час гарачы...
Гною скарбаў не шкадуе,
Як дажджом па полі скача.

І да “жытняй” дзень ахвочы,
Да гарэлкі з хлебным потам –
З дошкі гонару у вочы
І сабе маргнуць пад плотам.

## Адраджэнец вёскі

Не араў ніколі –
Выкарчоўваў, зносіў
Барацьбіт у ролі
Знітавання зносін

Паміж селянінам
І рабочым класам,
Каб сям’ёй адзінай
Хлеб жавалі з маслам.

І казаў: “За волю,
За народа шчасце
Злыдня бы адолеў,
Разарваў на часці!”

А вёсцы – нічога,
Ані-ні, ні трошкі –
Пра наказ ад Бога,
Каб сушыла дошкі.

## “Добраахвотныя” ахвяраванні

Параелі вантробы,
І не кінеш зірк коса, –
Аднадзённы заробак
Дзяруць з кожнага носа.

Збор ідзе па загаду,
Як было ўжо калісьці,
Калі ўсе клялі ўладу
Без асобай карысці.

Для Радзімы не шкода
І душу на алтар...
І лухту пляце згода...
І збянтэжаны твар.

І усё дабрачынна,
І усё чэсць па чэсці...
Не шкадуйце Айчыне
Хлеб зароблены есці.

## Апазіцыйныя матывы

Мінуў пісьменніцкі з’езд.
У наступ ідуць амазонкі.
А Сыс прапівае “Пан Лес” –
увесь да апошняй сасонкі!
Данута Бічэль

Мітрэнжыць слых вуха і рэжа
Дасціпнась грамадскай суполкі,
Што выйсце шукае з мярэжы
Шматколернай песняй вясёлкі.

Глушэц стрэл гарматны не чуе,
І кліч падсвядомасці – Боскі...
Дарогу, дарогу вярстуе
Туман у прапітыя вёскі.

Бунтарства на пласе скуголіць
На вырак улады келейны...
І спрэчкі “Тутэйшых”* пра волю
Сплылі у здабытак музейны.

* Літаратурнае аб’яднанне
“Тутэйшыя” пры СП БССР.

## Не дражніце ўладу

Ўлада для народа!
Выдумалі ж нешта:
Ілюзорнасць згоды
І па карку – рэшта.

Не дражніце ўладу,
Мае статус – вечнасць,
Не шукайце ў вадах
Яе недарэчнасць.

## Маладзёжны мітынг

Хлопцы і дзяўчаты!..
Сполахі тусоўкі!..
Лялькавод крылаты!..
Здобныя лістоўкі!..

І ляціць да мэты
Іх цягнік-бязмежжа,
І важак з імпэтам
Без шпаргалкі рэжа;

І шуміць бурліва
Пена маладая,
Лялькаводу грывай
Сцежкі падмятае.

## Стольны лектар

Шалеюць бясхмарныя прымхі,
І кліча людзей шлях патолі
З выявай бясплатнай скарынкі
Галоўнай у пафасной ролі.

І кліча званок стометроўкі
На ўзвышша імпэт пераможцы –
З кармушачнай клеткі салоўкі
Іграюць на шахматной дошцы...

Ў цэйтноце вятрыска дурманіць...
І хмеліць багульнік балотны...
І сэрцы двурушнасцю раніць
Змагар за «свабоду» залётны.

## Ліцэнзіі

Узяў ліцэнзіі: на сон,
На збор грыбоў, паветра,
На маладосць да скону дзён,
На секс у стылі рэтра;

На вольнасць думкі і ваду,
Каб піць з жывой крыніцы,
І на той свет, куды пайду,
Каб стаць вярбою ніцай;

На ілюзорны ў вечнасць шлях,
На праўду і свабоду,
І каб не строіў на касцях
Урад з народам згоду.

## За мяжой

Усё тут чужое, не грэе душу:
І споведзь з падвохам, і хітрая літасць,
І, нават, калі мне гавораць: "Прашу", –
Я добрае слова з ліхім магу зблытаць.

Тут, нават, бярозкі ў самотнай тузе
Блукаюць не ў модных панчошках,
І ранак грыбны не з туману ідзе
Па заячых вузкіх дарожках....

## Падтанцоўшчык

І не трэба інтэлекту –
На яго табу і стоп.
Ён сваю уносіць лепту,
Як чаляднік і халоп.

І не трэба значных ведаў,
Каб здавацца вельмі пільным –
Падтанцоўшчык – жарсць і крэда,
І звініць званком мабільным.

Падтанцоўка, падтанцоўка
З дзён мінуўшчыны па сёння –
І кар'ерная пляцоўка,
І жуды сівой бяздонне.

## Прэстыжна

Прэстыжна – прабіцца ў людзі
І скінуць сядзельца з гарба,
І верыць, што болей не будзе
Твой мур цытадэллю для лба.

Прэстыжна – крутая машына,
Падвешаны добра язык,
Катэдж для дачушкі і сына,
Пры шкурнай гамонцы шашлык…

Прэстыжна – сядзець на пасадзе,
Чыхвосціць і ў грыву, і ў хвост,
Чыхвосціць людзей за бязладдзе,
Чыхвосціць людзей за іх кошт.

## Акно

Нібы ў маленстве, разгадаць бяруся
Мазаіку зімовага акна.
Яўгенія Янішчыц

Аслепла ад восеньскай сцюжы
Па мерках не Боскай прыметы...
І зайчык не зіркае ў лужах
З імкненнем дабрацца да мэты.

І сонца праз хмарныя дзіркі,
Не скаліць для люднасці зубы,
І сцюжа – пад колер заціркі
Матыў напявае свой любы.

І ў твар не заглядваюць плёткі
З пякучай, гарачай крыніцы,
І душу не грэе салодка
Разгадка чужой таямніцы.

## Асаблівасці светаўспрымання

Рунее жыта
Вясеннім ранкам,
Цягнецца ў неба,
Дзе жаўрукі,

Першага снегу
Чакаюць санкі,
А мы чакаем
Моцнай рукі.

Жыта пажоўкла
І стала спелым,
А люд застаўся
Заўжды пакорным —

Не называе
Белае белым
І, ні дай Божа, —
Чорнае чорным.

## Памяркоўныя

Не ад панскай крыві,
Не з высокім палётам –
З Богам згоды жылі
І «нятленным аплотам».

Самадумства не зналі
І не ўмелі браць рэнту,
Самаходзь не знікалі
Назаўжды і дашчэнту.

Памяркоўнасці плынь:
І памысна, і пекна,
І не верыцца ў стынь,
І гарачае пекла...

Не вялікая згуба –
Без дзяржавы і мовы...
А ці будзе бяззубы
Хоць калісьці здаровы?

## Заложнікі мужнасці

За Айчыну гатоў аддаць
і жыццё – толькі не сваё.
Тутэйшае.

Люцыпар даў дзеткам пасаду
У службах дзяржаўнай бяспекі,
Каб мужна хвалілі уладу
І люд пасылалі на здзекі.

І гінуў народ ў Ленінградзе,
Пад’еўшы блакаднага хлеба,
І д’ябал крычаў на пасадзе:
“Ахвяру, ахвяру нам трэба”.

І гінуў заложнік у Мінску
За Кубэ, гаўляйтэра-гада...
І гонар, і гонар учынку...–
Святым называе улада

## З успамінаў бацькі –
паліtвязня, 1948 – 1953г г.

### 1. На радасць вар’ятням

Жыву у Краіне на радасць вар’ятням
Дзе ідал выпісвае лекі,
Падлізам і подлым заўсёды бясплатна
За тое, што клёк адпраўляюць на здзекі.

На хвалі палыннай зубастага смутку
Тупая сілішча і вэрхал,
А хто не умее скакаць пад іх дудку
Прыдушаць дэкрэтамі зверху.

Віхурыць атрутай асіплая згода
Манкуртаў з крыніцай маньяцтва,
Што рвуцца шалёна да геннага кода,
Каб люд і ў пятлі мог смяяцца.

## 2. **На зоне:**
Варкуцінскі ГУЛАГ

Мароз і голад – пабрацімы,
Не чуюць гора і бяды...
І крыж памерлым ад Радзімы
Тут не шукае іх сляды.

Тут край зямлі не выпадковы,
І люд – з сядзельцам на гарбе...
І вельмі верацъ злыдню слова,
Што нізашто іх тут заб’е.

Тут кожны дзень  клянуць пачвару –
Ачалавечанага монстра,
Які на мушку ўзяў ахвяру,
Што ў спіску лічыцца, як контра.

## 3. Ах, як шкода людзей

Ах, як шкода людзей,
Што жывуць у вар’ятні
Без высілкаў і дзей,
Дзе рубеж іх астатні,

Дзе быльнёгу раздолле,
Дзе шчыруе плюгавасць,
Дзе чумное застолле
Успрымаюць за сталасць;

Дзе бясследна знікаюць
І, як вынік яскравы,
Пры жыцці паміраюць,
Не закончыўшы справы.

Ах, як шкода людзей,
Што жывуць у вар’ятні...
Толькі ў гэтай бядзе
Пэўна, й я не астатні.

4. **Пра дарагі Дзень Вызвалення**

Без бацькі хата рэй вядзе
І не пяе салоўка –
“Святкуе” ён: у Варкуце,
На лесанарыхтоўках...

З Крамля нясецца густы бас,
Што шлях наш будзе зорны...
І  свет не з радасці пагас...
І прышласць –  хмарай чорнай...

Згіноты пробліск скрабануў
Тутэйшы люд касою,
Каб людзі зведалі ману
Навейшага раскрою,

І на свае не раз кругі
Вярталі генаў памяць,
А сімвал слова *дарагі*
Хай чорнай фарбай плямяць.

## Бацькоўская віна

Вінаваты за шчырую працу
На палетках дзядоўскай зямлі,
Што гарбом справаздачным намацаў,
Што сказаць для каго і калі.

Вінаваты за тое, што дыхаў
Генетычным паветрам буслоў,
Што кляймо пра заходніка ліхасць
У Маскве разумелі без слоў.

Вінаваты за тое, што верыў,
Што да Бога у Вечнасць ідзём,
І не знаў прадпісання паперы
На расправы з кулацкім жыццём.

## Мова

*

У маёй Беларусі няма беларусаў
І няпраўду гавораць пра “кут”
Нават тыя, што йшлі пад прымусам
Ў беларускую школу пакут:

У здзіўленні бянтэжацца твары,
Калі чуюць “нерусскую речь”,
Быццам коннік з-за чорнае хмары
На іх галавы выцягнуў меч.

Плынь вякоў перасохла ў пустыні,
Памяць душыць жуда ланцугоў,
Нават звон ад згарэўшай Хатыні
Далятае не з матчыных слоў.

Вінаватага, пэўна, асудзяць
І навучаць людзей мазалі,
А ці ж вырастуць, вырастуць людзі?
І ці  ж будзе такое калі?

*

Улюблёнасць не у роднае,
Не ў бацькоўскае, матчына.
Чалавечае, годнае –
Ці ж не чуеце? – страчана.

Для нас мова, бы мачаха,
Са здзіўленнем  – не руская,
Бо абрыдла-лядачая,
Не гаворым, а лускаем.

І не нам рэха прашчураў,
І не нас памяць кліча,
І не нам мова лашчыцца
Ад Гародні да Крычава.

*

Ну, куды і навошта ты прэшся,
І няпрошана лезеш на воз,
І з сівой даўніною, нарэшце,
Навязаць асмяляешся мост.

Без цябе пра здзічэлае поле,
Пра гады гаварлівай тугі
Адшумела тубыльскае голле,
Адзвінелі людзей ланцугі.

І твой код з генетычнае вёскі
Засмактала бяспамяцтва гаць,
І у драме растаўлены коскі,
Ды і кропкі даўно ўжо стаяць.

*

Бабахаў, быццам з дубальтоўкі,
У Польскім  сейме беларус,
І, аж да неба, –  забастоўкі,
Каб памяняць для мовы курс!

Каўчэг разгойдвалі з Расіі
І перлі грошы на змаганне,
І драли горла фарысеі,
Што нам з сястрою лепей стане.

І стала так, як у Расеі:
І Калыма, і воз маны,
І ў Курапатах фарысеям
Ад крыўды плакалі званы...

..........................................

Знікалі лепшыя – не з горшых...
Адукаваныя – ў расход...
І даставаў Іуда грошы
За свой загублены народ.

*

Душылі Слова ў Беларусі
I  польскі енк, і рускі бот
I стаўся аістам наш бусел,
Згубіўшы спадчыннасці код.

I ножкай дрыгае, як аіст,
I ганарыцца яго клёкам,
I больш не селіцца ля стайні,
Каб ахапіць балота вокам.

I белых крыл не любяць гоні,
I чужаку не лічаць *скабы,*
I родны бусел на улонні
З пагардай ставіцца да жабы.

*

Ці сонца пагасла, ці пуні пустыя,
Ці князь не ў сваю закахаўся,
Ці грошы суседкі любіў залатыя –
Ад Мовы слядочак застаўся.

Рубельчык рашуча абшары асвоіў
I вабіць аршыннаю цнотай,
I моўную бездань тубыльца падвоіў,
I трушчыць, і трушчыць употай.

I сёння ў нас тое, што бачым і маем:
З няўдобіц калючую пожню,
Без скарбаў бацькоўскіх у цемры блукаем,
Маўкліва свідруючы поўню.

*

Хапала Табе касцёлаў,
Цяпер дабіваюць у цэрквах
Ад імя рускамоўных анёлаў
Па брацкіх навыраст  мерках.

I болей не кажа пекна
На матчынай Мове Хрыстос,
Адправіўшы сябра у пекла,
Узняўся глагол ва ўвесь рост.

*

Назбіралася грахоў
Ў чортавай сявеньцы.
Нам не гіцлі псуюць кроў –
Дзеці-адшчапенцы.

Ім не трэба нашых слоў –
Вучаць мову Крышны,
Колер Слуцкіх паясоў
Ім таксама лішні.

Матчын голас у бядзе,
Кволы і нядужы,
Засыхае – не цвіце
Кветкай пышнай ружы.

*

Самы даходны
І вечны тавар,
Хоць стогне
І плача Айчына,

У люстры Крывіцкім,
Пазнаўшы у твар,
Хрыстапрадажніка –
Роднага сына.

Мовай гандлюе
Бяскосны язык
І мліва яго
У пашане –

Да ўлады прыцёрся,
Да крэсла прывык,
Балбоча штодня
На экране.

*

Праз крушню ірвецца да неба трава,
Суседзі шыбуюць – не крокам,
А родная Мова, бы тая ўдава,
Зайздросным паглядвае вокам.

І дзіўна мне слухаць малебны і плач
Паэтаў з трагічнасцю Лоркі,
Якія не бачаць свой родны калач
І лёс праклінаюць наш горкі.

## І Богу свайму ты не молішся, браце.

На пачатку было Слова.
І Слова было – БЕЛАРУСЬ.
Анатоль Бутэвіч

Ускрылены Богам, надзеяй, каханнем
Чакае духоўнасць скалечаны край...
Прыслухайся, браце, як жаліцца каня,
Які ў яе плачу штодзённы адчай:

Вакол пустаслоўе, марозы і спёка,
У храмах Айчыны анёлы без крыл,
Самотны Скарына падморгвае вокам,
У Тураве стогне ад жаху Кірыл.

А ў Полацку крыж Еўфрасініі нашай
На плечы не ўскінуў свае беларус –
З вытокаў Крывіцкіх не п’е сілу нашча
І лезе ў абдымкі да грэшных спакус:

З пагардай і ганьбай да Роднага Слова,
Без веры і моцы – сляпы ад сляпых...
Загон засявае не свой адмыслова,
Бо Роднае рэжа знявечаны слых.

Жыве без заранак, валошкавых раніц,
Жыве без пушчанскіх зуброў і лясоў...
І Мовы скананне нябёсаў не раняць,
І сын адхрысціўся ад родных бацькоў.

Чужынец у Краю, чужынец у хаце,
З гаючай крыніцы не корміцца дух,
І Богу свайму ты не молішся, браце,
Ты Бога свайго зачыніў у катух.

## І трэба ж такое?

На Украіне зачынілі апошнюю
рускамоўную школу.
З паведамлення Расійскага
тэлебачання ад 26.11.2007 года.

І трэба ж такому адбыцца ў суседа?
На Мове бацькоўскай гаворыць,
На Мове матулі, бабулі і дзеда
Рагоча, і вучыць, і соліць.

І генная памяць ўваскрэсла на радасць,
А мы пра яе і не чулі,
Хоць раніцай роснай выходзілі разам
На поле у зрэбнай кашулі.

## Чарговае развітанне
## з цыгарэтай

Праз трыццаць год, як блудны сын,
(Ні гонару, ні звання)
Рашыў адправіць на спачын
Маё к табе каханне.

Гляжу, як грэешся ля ног,
Смакуеш водар маю...
Ізноў на ростанях дарог
Мая душа блукае.

І бачу, быццам ты ў труне,
Падморгваеш мне хітра:
“Прыйдзеш, прыйдзеш ты да мяне,
Як высмакчаш паўлітра”.

## Пасля трохдзённага катавання на вяселлі

У святле затуманеных вуліц
Гаманілася нешта.Аб чым?..
Белы конь, бы ў смяротнай кашулі,
У трызненні прарочыў спачын...

І шалёныя водгукі сэрца,
Як на скачках: хутчэй і хутчэй...
І агеньчык зноў бліснуў праз шкельцы,
З яшчэ паўсонных вачэй.

## Боль

Лямантуе мудра
Жоўтым святлафорам
Перад тым, як пудрай
З'яднаць скроні з горам.

Пазнае прычыны –
Там, дзе й розум проціў, –
Першае маршчыны
Занядбалай плоці.

Бы прышчэпкай Божай
( З бізуном хаця),
Як ніхто, паможа
Вырасціць дзіця.

І падкажа шчыра,
Калі важыш – з гакам,
Што жывеш над вірам
Ад яды са смакам.

## На кладах

1.

Сваволяць, маладзеюць
Пад дождыкам грыбным,
Пасуць жыцця надзею:
Застацца маладым.

Ні рыпу, як і – плачу,
У росквіце – дубы…
Сярод знаёмых бачу
І я свае гады.

2.

Ні ім дождж, ні ім сонейка,
Ні грыбное застолле,
І загадкі для сонніка
У андарачным прыполе.

Цішыня запаветная...
І птушыныя песні...
І наложана вета
Тут на слова ўваскрэсні.

## З сёмага паверха

Неяк жудасна ,
І
не крыху,
Калі так квітнее сад—
Ці ж не чула роспач крыку,
Як ляцеў яе салдат?

Мо ніяк не змог ужыцца –
Не статутны цісную́ прас,
А мо проста: стала сніцца,
Што другі з ёй бавіць час?

А мо верыў у здані шчыра,
Што шапталі суткамі?
Паляцеў да долу гірай
І бясконца чуткамі.

## На пахаванні

І разышлася,
Таму, што піў,
Пасля жыла
Не для кахання.

Хто вінаваты,
Хто загубіў
Іскру ў жанчыне,
Яе прызванне?

Можа  не той,
Можа не тая?
Мо здзекі лёсу?
Чорнай маны?

І толькі вецер
Ёй пасылае
Лістом апалым
Паклон зямны.

Паталагаанатам

Самы разумны
У медыцыне:
Паставіць кропку,
Лекару – пару...

Астанкі верне
Шаноўнай гліне...
І ні падзякі,
І ні навару.

## Прывітанне ад сяброўкі з касой

У дванаццаць без чвэрці
Чую стук ля акна!
Каб схавацца ад смерці,
Кажу: ў хаце няма,

Пашукай за вугламі,
 А не знойдзеш – ідзі,
Дзе прадонне з даўгамі,
Дзе гандлююць людзьмі.

Сэрца б’ецца трывожна,
Страх  пятлёю душу...
А скажы, калі можна,
Ці ты маеш душу?

І яшчэ – паміж намі –
Ты вось тут выпадкова?
І убачыў з агнямі
Над сабою анёла.

## Лячэнне

Сказалі сілас есці,
Вала асвоіць пашу
І ведаць справу чэсці –
Не піць за долю нашу.

А водар тых прысмакаў
Ажно да страты пульсу –
Упёр бы адным махам
І вэнджаную кульшу.

Над Нёманам Каложа
Падморгвае вачыма,
Што так рабіць нягожа,
Што грэшны я, магчыма.

З сабой вяду змаганне,
Каб дух мацней стаў сталі,
А продкам пра спатканне
Кажу, каб пачакалі.

## Крамлёўская таблетка*

Не шукай яе, браце,
Быццам папараць-кветку,
Бо не знойдзеш на карце
І няма яе сведкаў.

Эліксір ад хваробы
Бог бясплатна дае
І набіў ім аскому…,
І не толькі табе.

Пашануй Яго працу
(Ён знямоглы, стары),
Яго лекі памацай
І бясплатна бяры.

* Лякарства былой
Крамлёўскай эліты.
У часы СССР – чарговая
панацэя ад хваробаў

## Не хапае

Калі замала
І не хапае
Грошай ахвярных
На паратунак,

Бяды прычыну
Тады шукаем
У чорным пекле
Уласных думак:

Песні і скаргі
Чарней, чым сажа,
Дзе  не хапае
Апошняй болькі,

Толькі чамусьці
Ніхто не кажа,
Што не хапае
Розуму толькі.

## Салодкі грэх

Не кідаю брудных ценяў
На зямны, салодкі грэх,
Прадзіраюся праз церні,
Каб ізноў пачуць твой смех.

У здабытку каляндарным
З бездарожжа і надзей
Без цябе мой дзень – ахвярны,
Без цябе сярод людзей.

Хай гарыць агонь гуллівы
Зграбных ножак і страсцей,
І спаднічкі гаварлівай –
Летняй ночкі карацей.

## Нячысты дух

І мой дух грашыць умее,
Калі выйдзе нанач з вёскі,
Дзе пад знакам Вадалея
Аб ім ходзяць пагалоскі.

Праўда ловіць за хвост байку,
Яшчэ больш— людскую споведзь.
Адзявай, браток, фуфайку
І грашы пакуль не зловяць.

## Заложнік зорак

Ты помніш жыта на узгорку
І веццем высланую сцежку,
Як загадала ты на зорку
Пад таямнічую усмешку?

Я з той пары заложнік зорак,
І шчасця большага не знаю,
Калі выходжу на падворак
І тую зорачку шукаю.

## Непаўторная

Ты адзіная,
Непаўторная –
З захапленнямі
Ад мяне.

Накрываю цябе я
Коўдраю
У цнатліва-самотным
Сне.

Не знайсці мне
Кветку лепшую
І пяшчотную
На зямлі...

Тэлефаксную
Шлю дэпешу я:
“Дзе сустрэнемся
І калі?”

Калі нават што
І не збудзецца –
Ты ж з Прынёмання, -
Падмані.

Хітрасць бабская
Ў нас не судзіцца
А ніколечкі,
Ані-ні.

## І вір бурлівай рэчкі

Ружовым воблакам плыве
Малочны дым з балота,
І цень разлёгся на траве,
Стракаціцца – ад плота...

І свечкі стройныя бяроз,
І вір бурлівай рэчкі –
Паміж табой і мною мост,
Як Шлях на небе Млечны.

## Цяпер і тут

Цяпер і тут.І так заўсёды,
І не згубіла мудрасць крэсла,
І смак спазнаўшы асалоды,
Для нас у прымаўцы ўваскрэсла.

Бо толькі раз цяпер і тут,
І не паўторыцца ніколі
І гэты дзень, і гэты кут,
Каб разам з'елі мы пуд солі.

Цяпер і тут – канва для згоды,
Каб аб'яднаць з душою цела,
Каб ты наўмысна, як заўсёды,
Ад пацалункаў толькі млела.

## У стылі рэтра

Такіх не штампуюць серыйна,
Такая адзіная ў свеце:
Па небе, вяслуючы плынна,
Плыў месяц у срэбнай карэце.

Чароўная ціш наваколля
Пад колер падобны агату
Прынёманскай песняй да столі
Нясласа на хвалях у хату.

Заглядвала ў вокны рабіна,
Бярозка і куст ядлаўцовы...
Найлепшая ў свеце дзяўчына!
І дзень у жыцці – каляровы.

Ў ружовым бяссонні паветра
І смак пацалункаў спакусны...
Як казка – прагулка у рэтра, -
Салодзіць усмешкаю вусны.

## Паэзія

То ямбам расквечвае стопы,
То кружыць харэем у танцы,
То дактыль падкіне у тропы,
То буру узніме у шклянцы;

То блісне агнём Праметэя,
То роснаю сцежкай пакліча,
На год, ці на два анямее
І зноў жураўлём закурлыча.

І смецце Ахматавай ўспомніць
З якога стварае шэдэўры,
Каб вершаў люстраная роўнядзь,
І кветкі падлечвалі нервы,

А мове ў Пракруставым ложы
Раскажа Парнаскія былі,
Каб людзі ад Буга да Сожа
І роднае Слова любілі.

## Слова

Каб Радзімай стала Слова,
Зазірні у генны код
З беларускаю асновай
І цвярдыняй, як аплот.

А каб слова стала плоццю
Аўтара, бы фрэскаю,
Ахрысці яго ў палёце
Мудрасцю біблейскаю.

А каб людзям дайшло Слова,
Пасалі яго, паперч,
Ды глядзі, каб не замнога –
Бумерангам будзе смерч.

## Закладка ў кнігу
## Юркі Голуба

Юркі голуб кальцаваны
І не знікне на Парнасе
Беларускае нірваны
Ні ў прасторы, ні у часе.

## Вершы

Хачу крылатых, як Пегас,
З блакітным перазвонам,
Каб у ліхі і добры час
Гудзелі, як з амбона.

Дзе б думкам вольны быў прастор,
А слову вельмі цесна,
Дзе б актуальнасці задор
І заўтра сеў у крэсла.

Хачу на мове – не чужой,
Не посных, а з прыправай,
Каб не ядналіся з іржой
Пасля хрышчэння славай.

Хачу прыгожых, як нявест,
З пяшчотнаю усмешкай,
Каб не спазналі цяжкі стрэс,
Калі ўцалеюць рэшткай.

## Свой Бамонд і Парнас

Рэдакцыйнай радзе ЛіМа

Не прабіцца да Вас
Ні з цукеркай, ні з ёдам –
Свой Бамонд і Парнас,
І не з лепшым расплодам.

Няма свежай крыві...
І ніводнае пешкі:
Ўсё тузы, каралі...
З барадою усмешкі.

Патрыярхам – кілім
І свае ў ЛіМе суддзі...
Як ні глянь, як ні кінь –
Не прабіцца у людзі.

## Цягне

Да вытокаў, дзе радзіўся,
Змерыў  вокам вышыню,
Дзе з матуляю хрысціўся
Перад Богам ўпершыню;

Дзе бусліны клёкат звонкі
Будзіць рэхам далячынь,
Дзе над жніўнаю старонкай
Жаўрукову слухаў сінь;

Дзе трымалі кроны сосен
У далонях дух лясны,
Дзе зажураная восень
Заглядала ноччу ў сны;

Дзе гняздо бацькоўскіх продкаў
З ніў азёрных і лагчын,
Дзе тутэйшы дым салодкі
Запрашае на спачын.

## Лаўлю вецер
## і экстрым

Каб да скону
На нагах,
Каб не ўпасці,

Каб адчуць
Крыла узмах –
Лаўлю страсці,

Лаўлю вецер
І экстрым –
Прэч прыкметы

І дарогу
Ў святы Рым*,
Як пункт мэты.

* Павер'е ў каталікоў:
хто пабачыў Рымскага Папу,
будзе жы

Літаратурна-мастацкае выданне

Курыловіч  Мечыслаў Пятровіч

Прыдарожная вярба

Вершы

Рэдактар Юрка Голуб
Камп’ютэрны дызайн і вёрстка
Таццяна Марчанка

Падпісана да друку 24.06.08
Фармат 75х90 1/32
Ум. Друк. Арк. 4,96. Ул.-выд. арк. 4,8
Наклад 100 экз. Зак.3743 “у”

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Гродзенскае унітарнае паліграфічнае
Прадпрыемства ”Гродзенская друкарня”

ЛІ “№ 02330/0133231 ад30.04.2004г.
ЛП № 02330/0056624 ад 27.03.2004г.

Вул. Паліграфістаў, 4, 230019 Гродна.



ISBN 978-985-6835-33-2